*Сяло ці вёска ў родным краю*
*Гісторыю сваю або легенду мае.*
*Хвала таму, хто гэты скарб збірае*
***Г.А.Станевіч* “Іаланце Валуевіч з удзячнасцю”**

## Агульныя звесткі

Спондаўская бібліятэка-філіял Астравецкай ЦБС абслугоўвае 382 чытачоў, з іх 133 - дзеці і 71 – моладзь. Гэта адна з нямногіх бібліятэчных устаноў, дзе, нягледзячы на малую колькасць новых паступленняў, захоўваецца камфортнае бібліятэчнае асяроддзе. Бібліятэкарам тут вось ужо звыш 30 год працуе заўзяты летапісец Спондаўскай зямлі, мясцовая жыхарка, магчыма ад таго і шчырая краязнаўца, улюбёная ў сваю малую Радзіму – ***Іаланта Францаўна Валуевіч***. Не толькі ў сілу сваёй прафесіі, але больш па парыву свайго сэрца, імкнецца гэта жанчына падняць шырокі пласт мясцовай культуры, побыту, захаваць сувязь не толькі былых і сённяшніх гадоў, а і нават пакаленняў, ці людзей, якіх узгадавала Спондаўская зямля і якія, на жаль, разляцеліся па вялікай краіне. У свеце сённяшніх дзён, Іаланта Францаўна пайшла па шляху культурна-масавай работы – актывізавала збор матэрыялаў краязнаўчага характару і, адпаведна, прапаганды іх сярод насельніцтва, асабліва дзяцей і моладзі.

## З гісторыі бібліятэкі

Задаволіць свае патрэбнасці ў чытанні ў тыя гады, калі яшчэ не былі створаны савецкія бібліятэкі, людзі маглі з некалькіх крыніц. Па словах старажылаў, у 30-40-я гг. мінулага стагоддзя існавалі бібліятэкі з невялічкімі фондамі ў пачатковых школах, якімі карысталіся толькі дзеці. Былі бібліятэкі і пры школах-сямігодках (на дадзенай тэрыторыі іх было дзве – у Клюшчанах і Жукойнях-Жэлядскіх). Яны былі больш разнастайна ўкамплектаваны, колькасць экзэмпляраў таксама была большай. Такімі бібліятэкамі дазвалялася карыстацца і дарослым.

Поруч са школьнымі існавалі тады і аматарскія бібліятэкі. Так, па звестках, якія сабрала І.Ф.Валуевіч, у тыя гады самымі шматлікімі былі прыватныя бібліятэкі:

-Сусвілы Юзэфа з засценка Навалессе, які меў пераважна гістарычную і мастацкую літаратуру;

-Ракіцкага (імя невядома) з в. Казаноўка, якая налічвала больш палітычных кніг. Вядома, што сам гаспадар жыў у Вільні і быў пакараны за палітыку;

-Рабовіча з засценку Фаліна;

-У Клюшчанах, у бытнасць ксяндза Лёнгіна Іванчыка, была адкрыта ўстанова "Огніско", якая сумяшчала ў сабе бібліятэку, дом культуры і ваенна-спартыўны комплекс.

У 1937 годзе "Огніско" была закрыта, бібліятэка перайшла да ксяндза Адама Вайцяхоўскага і размяшчалася ў плябаніі. Загадвала гэтай бібліятэкай дзяўчына з в.Кісялі Трыбоцкая Кацярына Францаўна. Большую частку бібліятэчнага фонду складала літаратура рэлігійнага зместу, гістарычнага, медыцынскай тэматыкі. З мастацкай літаратуры вядомы кнігі такіх аўтараў, як Стэфана Жэромскага, Генрыха Сенкевіча, Івана Тургенева, Эміля Заля, Адама Міцкевіча. Самымі папулярнымі былі кнігі Тадэвуша Даленга-Манстовіча "Знахар", якую перачытала ўся парафія, "Агнём і мячом" Генрыха Сенкевіча.

Гісторыя сучаснай бібліятэкі распачынаецца прыкладна з 1946 года, як і ва ўсім раёне, з хаты – чытальні. Пад яе мясцовыя ўлады (Косцевічскі сельскі Савет) прыстасавалі звычайную сялянскую хату ў цэнтры вёскі, гаспадары якой выехалі ў Вільню. Там жа размяшчаўся і клуб. Першую загадчыцу хаты-чытальні звалі Ліда Калеснікава. Яна была не з мясцовых, са Свіра, дарэчы, райцэнтр тады таксама быў у Свіры. Вядома, што яе муж, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, таксама працаваў у Спондах (нейкім начальнікам, дакладна якім, не ведае сёння ніхто з

жыхароў). Пасля ранення на вайне ён быў моцна хворы і ў хуткім часе памёр. Пасля яго смерці выехала з гэтых месц і Ліда, а хату-чытальню прыняў малады хлопец з Косцевіч – Рамуальд Малеўскі.

Кніг тады было мала, асноўнай формай масавай работы з'яўляліся гучныя чыткі газет, часопісаў, у асноўным грамадска-палітычных.Танцы арганізоўваліся кожную суботу і нядзелю.

У 1953 годзе ў Спонды з Косцевіч быў перанесены сельсавет і старшынёй сельсавета назначаны малады камуніст са Свіра Налівайка Альбін Міхайлавіч. Яго жонка – Соф'я Мечыславаўна з 15 красавіка 1953г. стала працаваць ў бібліятэцы. Жанчына яна была прыгожая, вясёлая, да таго ж любіла спяваць і мела прыгожы голас. Культурна-масавую работу яна вяла вельмі актыўна.



***(трэцяя брыгада калгаснікаў брыгадзіра таварыша Рабовіча.Дажынкі. 1953 год)***

З аповяду С.М. Налівайка:

-Лацвей было тады працаваць, у адных Спондах было чалавек 60 моладзі, музыкантаў, таксама, на выбар. Працавалі розныя гурткі – танцавальны, харавы, сольны. Моладзь цягнулася ў клуб. Ездзілі на агляды ў Свір, Смаргонь. Весела было тады і жыць і працаваць.

А вось кніжкі менш чыталі. Пісьменных тады было мала. Чыталі, у асноўным, дзеці. Ды і кніг было мала, большай часткай газеты і часопісы, брашуры, кніг крыху дасылалі з бібліятэчнага калектара, нешта прыносілі людзі. Праводзіліся дні ўшанавання лепшых працаўнікоў калгаса, провады камбайнераў у поле, святы дажынак. Ад тых дзён захаваўся фотаздымак свята дажынак таксама ў той жа брыгадзе ў 1958 годзе.



***(фота Р.С.Памецька)***

У студзені 1955 года Соф'я Мечыславаўна пайшла ў дэкрэтны адпачынак, а бібліятэку прыняла Крывулько Галіна са Свіра. З 1959 па 1961 працавала Паўлючонак Галіна Казіміраўна.

У 1961 годзе быў пабудаваны новы будынак, у якім размясціліся клуб, бібліятэка і кантора калгаса імя Янкі Купалы.

З 1961 па 1969 год працаваў у бібліятэцы Буйніцкі Казімір, мясцовы хлопец са Спондаў, які слыў добрым музыкантам. У клубе ў той час працавала жонка старшыні калгаса Мурашка Шура. Таленавітага бібліятэкара запрашалі ўдзельнічаць ва ўсіх аглядах, канцэртах, святах.

У 1969 годзе Буйніцкі перайшоў працаваць на калгасную ферму з-за таго, што зарплаты там былі большыя, чым у сферы культуры, а ён да гэтага часу ўжо быў жанаты і меў двух дзяцей.

З 1969 па 1970 года бібліятэкарам працавала дзяўчына са Спондаў Міхновіч Галіна, якая адначасова вучылася ў Ашмянскім тэхнікуме на бухгалтара.

## Характарыстыка бібліятэчнай работы

Іяланта Францаўна Валуевіч прыйшла працаваць у Спондаўскую бібліятэку ў 1970 годзе, у наступным паступіла на бібліятэчны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя М.Горкага. У зону абслугоўвання ў тыя часы ўваходзіла 18 населеных пунктаў. Сёння гэта зона нашмат меншая.

***Колькасць населеных пунктаў у зоне абслугоўвання***

| **1970год** | **2004год** |
|---|---|
| Спонды | Спонды |
| х. Глушыца I | Глушыца |
| х. Глушыца II | Акартэлі |
| х. Глушыца III | Горшавічы |
| х. Глушыца IV | Гінкішкі |

Акартэлі
Горшавічы
Гінкішкі
Кайміна
Бондзішча
Ёдабор
Косцевічы
Прудзішча
Жукойні-Жалядскія
Гудалі
Старая Жэлядзь
Асташышкі

Кайміна
Косцевічы
Жукойні-Жалядскія
Гудалі
Асташышкі

**Рух фонду Спондаўскай бібліятэкі 1972 - 2004 гг.**



***(на кожны слупок года знізу прыпадае літаратура ў тыс. экз. злева)***

У 1978 годзе была створана адзіная Астравецкая ЦБС і Спондаўская бібліятэка стала філіялам №41. Кніжны фонд у той год налічваў 8518 экзэмпляраў, якім карысталіся 503 чытачы. Цэнтралізацыя дазволіла атрымаць новае абсталяванне, двухбаковыя кніжныя стэлажы, вітрыны, каталожныя шафы, бібліятэчную кафедру, сталы і крэслы, пішучую машынку і інш. Пры Спондаўскай бібліятэцы працавалі 4 бібліятэчныя перасоўкі ў вёсках Трашчаны, Гінкішкі, Горшавічы і галіновая на жывёлагадоўчай ферме ў в. Жукойні-Жалядскія. Іншыя вёскі даводзілася абслугоўваць падворнымі абходамі.

Яшчэ ў 1975 годзе Іаланта Францаўна была абрана сакратаром камсамольскай арганізацыі мясцовага калгаса “Савецкая Беларусія”, што давала магчымасць больш актывізаваць каля бібліятэкі моладзь. Праводзілася шмат цікавых масавых мерапрыемстваў, прычым шырока выкарыстоўваліся новыя формы – “круглыя сталы”, “агеньчыкі”і інш. У артыкуле Н.Рыбік “Камсамол не проста ўзрост”, які быў надрукаваны у “Астравецкай праўдзе” у 2003 годзе, прысвечаным 85-годдзю камсамола былы першы сакратар РК ЛКСМБ С.В.Шэін успамінае:

-“У мяне былі цудоўныя памочнікі – ініцыятыўныя энергічныя сакратары пярвічак, якім хацелася зрабіць нешта новае, цікавае. Той жа Васіль Гурскі, да прыкладу, які працаваў сакратаром у калгасе імя Куйбышава, Віктар Паршонак, ужо згаданая мною Іаланта Валуевіч, сакратар заводскай пярвічкі Генадзь Андрушойць. З імі працаваць было – адно задавальненне!”

За работу па патрыятычнаму і маральнаму выхаванню ў тыя гады І.Ф.Валуевіч была ўзнагароджана шматлікімі граматамі.



***(На раённых спаборніцтвах па лёгкай атлетыцы каманда камсамольскай арганізацыі к-са "Савецкая Беларусь" заваявала дзве Ганаровыя граматы***
***Удзельнікі-легкаатлеты: (злева направа) 1-ы рад: Шышко Ганна, Васілеўская Яніна, Чарняўская Тарэса; 2-і рад: Апрышка Іосіф, Волкаў Пётр, Валуевіч І.Ф., Сухарэўскі Андрэй)***

Бібліятэкар Спондаўскай бібліятэкі вяла актыўную грамадскую работу. Была абрана дэпутатам Спондаўскага сельскага Савета некалькі созываў. Часта бывала на сваіх выбарчых участках, сустракалася з выбаршчыкамі і гэта давала магчымасць працаваць з грамадствам і чытачамі ў больш цесным кантакце, што, безумоўна, павышала не толькі ўласны аўтарытэт, але і аўтарытэт бібліятэкі.Зараз І.Ф.Валуевіч таксама з'яўляецца дэпутатам 24 склікання мясцовага сельсавета.

У 1982 годзе І.Валуевіч правяла ў сельсавеце Дзень дэпутата, на які былі запрошаны юрыст райвыканкама. Сярод дэпутатаў (а іх у той час у сельсавеце было 25 чалавек) метадам анкетавання было праведзена апытанне з мэтай актывізацыі дэпутацкай дзейнасці, выяўлення праблем і дзейсных прапаноў.

У 1986 годзе прыярытэтным накірункам работы Спондаўскай бібліятэкі было абрана павышэнне якасці абслугоўвання аддаленых ад бібліятэкі вёсак. Па ініцыятыве І.Ф.Валуевіч пры Спондаўскай бібліятэцы было створана аб’яднанне работнікаў культуры Спондаўскага сельсавета, якія сумесна рыхтавалі і праводзілі буйныя мерапрыемствы і праводзілі іх ва ўсіх вёсках зоны абслугоўвання. (І.Валуевіч. Калектыўнымі намаганнямі //Астравецкая праўда, 1986. - №49. -24 красавіка. – с. 2).Ініцыятыву бібліятэкара падтрымала мясцовая ўлада. Старшыня калгаса Журавель М.К. на кожнае мерапрыемства выдзяляў транспарт, часта сам наведваў мерапрыемствы і выступаў перад жыхарамі аддаленых вёсак. На мерапрыемства, прысвечанае антыалкагольнай прапагандзе “Суд над зялёным змеем”, па ўласнаму запрашэнню І.Валуевіч, прынялі непасрэдны ўдзел тагачасны начальнік Астравецкага РАУС М.Басалыга і інспектар па справах непаўналетніх Л.Карвель. Мерапрыемствы, праведзеныя сумесна шырока асвятляліся ў прэсе:

Карвель Л. Суд над зялёным змеем”. – Астравецкая праўда.-1986. -13 мая.

“И вечер удался…”// Гродзенская праўда. -1986. – 27 ліпеня.

Дзякуем за свята. [Жыхары вёскі Стаўпяняты] // Астравецкая праўда. -1986. – 20ліпеня.

Запрашаем зноў у госці [Жыхары вёскі Кісялі] // Астравецкая праўда. -1986. 11лістапада

Томчик В. Чуткое слово // Гродненская правда. – 1986. - 27 ноября.

За тую работу І.Ф.Валуевіч была ўзнагароджана Граматай Гродзенскага абкама.

***Абслугоўванне адной з аддаленых вёсак***



***(выступленне калектыву перад насельніцтвам в.Рудня)***

У тыя гады Спондаўская бібліятэка актыўна пачала праводзіць святы вёсак. Адным з першых у раёне было праведзена свята вёскі Спонды, а затым і астатніх вёсачак сельсавета. На выключна мясцовым матэрыяле, які са слоў старажылаў збірала бібліятэкар, арганізоўваліся абрадавыя святы – Калядкі, Вялікдзень. Працавалі клубы па інтарэсах: “Ровесник” для моладзі і клуб “Здароўе”. За плённую працу тых гадоў Іаланта Францаўна таксама была ўзнагароджана граматамі.

Вельмі папулярнымі ў 80-я гг. сталі дні Памяці, якія праводзіліся ў лістападзе. Адной з першых у раёне І.Валуевіч арганізавала і правяла дзень Памяці на Клюшчанскіх могілках, самых буйных у Спондаўскім сельсавеце. Свята атрымалася гучным і запамінальным, сабрала некалькі сот прысутных – з’ехаліся з Літвы, розных куткоў Беларусі. Суправаджаў жалобную цэрэмонію духавы аркестр з Астраўца. Мерапрыемства было праведзена пры ўдзелу тагачасных раённых і мясцовых улад: загадчыка аддзела агітацыі і

прапаганды райкама партыі Я.Я.Строка, сакратара РК ЛКСМБ І.Прусакова, старшыні Спондаўскага сельсавета Я.І.Лукша, старшыні калгаса імя 50-годдзя ВЛКСМ З.Капуста. Пазней такія ж памінальныя святы былі праведзены на ўсіх могілках сельсавета.

§§§§

Яшчэ з канца 80-х – пачатку 90-х гадоў І.Ф.Валуевіч распачала карпатлівую ***краязнаўчую*** работу. Было створана і працавала краязнаўчае аматарскае аб'яднанне старшакласнікаў і моладзі "Спадчына", члены якога займаліся зборам фальклору: мясцовыя прыказкі, прымаўкі, тосты, смешныя здарэнні, вясельныя, жніўныя і інш. песні, прыкметы і варожкі і г.д. Гэтыя матэрыялы сабраны ў папкі, якімі цікавяцца і карыстаюцца чытачы. Асабліва папулярны яны ў студэнтаў. (Дапіўся. – Астравецкая праўда. -1994. – 15 жніўня; Паварожым. – Астравецкая праўда. -1995. – 23 снежня). Па ініцыятыве І.Валуевіч былі праведзены даволі буйныя мерапрыемствы раённага маштабу.

**Мерапрыемства, прысвечанае 110-годдзю з д.н. Я.Быліны**

Гучнае мерапрыемства пры непасрэдным удзеле Іаланты Валуевіч прайшло ў 1993 годзе ў Клюшчанах з нагоды 110-годдзя з дня нараджэння Янкі Быліны (Яна Семашкевіча) - паэта, пісьменніка, драматурга і перакладчыка. Удзел у ім прынялі ксёндз Міхаіл Сапель з касцёла імя святога Роха з парафіяльным хорам, Адам Мальдзіс, ураджэнец Астравецкага раёна, доктар філалагічных навук, скульптар В.Янушкевіч і мастак Я.Янушкевіч, беларускі хор касцёла святога Роха.



*Упершыню загучала беларускае слова ў вуснаў ксяндза Міхаіла Сапеля з касцёла св. Роха*



*Пасля імшы з нагоды 110-годдзя з д.н. Я.Быліны Клюшчанах ў Клюшчанскім касцёле)*

§ § § § §

Яшчэ з далёкага 1997 года, калі ўбачыла, што ў роднай мясцовасці ёсць нямала цікавых людзей, з пакалення ў пакаленне перадаюцца цікавыя легенды і паданні, адыходзяць у нябыт назвы вёсак, мяняецца мясцовы ландшафт, прыйшла да Іаланты Францаўны ідэя сабраць як мага больш каштоўных звестак аб мінулым краю, тых людзях, хто аддаваў свае сілы і здароўе гэтай зямлі, або хто ўслаўляў яе нават па-за яе межамі. Менавіта ў той год І.Ф.Валуевіч падключыла да свае працы юных памочнікаў – арганізавала аматарскае аб’яднанне для дзяцей “Бацькаўшчына”, дзе сабрала да дзесяці чалавек такіх жа, як і самых дапытлівых і цікаўных да гісторыі краю прадстаўнікоў маладога пакалення.

Члены “Бацькаўшчыны” арганізавалі выпуск краязнаўчай сценгазеты “Вытокі”. (Караткевіч А. Прэса Спондаўскага маштабу”// Раніца. -2003. – 03 мая.).



***(Рэдкалегія аб’яднання “Бацькаўшчына” з першым выпускам газеты “Вытокі”***

Традыцыйнымі сталі краязнаўчыя вандроўкі: у былы панскі маёнтак Шайкуні, на радзіму Казіміра Сваяка ў вёску Барані, да старажытнага дуба (хутар Кавалёўшчызна), да Святога каменя (Вялікая Вёска), да Глухога возера. У 2001 годзе з мэтай знаёмства і абмену вопытам наведаліся сябры з краязнаўчага клуба “Валошкі” з Мядзельскага раёну, якім кіруе Іван Драўніцкі. Затым гэтыя сустрэчы сталі добрай традыцыяй.





***(Сустрэча з краязнаўцам Іванам Драўніцкім і членамі яго клуба “Валошкі”.На 1-м здымку крайні злева І.Драўніцкі, Г.Івуць, навуковы супрацоўнік скарынінскага цэнтра)***



***(Члены клуба “Бацькаўшчына” ля Святога камня)***

## Майстры - разьбяры

За папярэднія гады Іалантай Францаўнай праведзена вялікая работа па ўшанаванню і папулярызацыі работ мясцовых майстраў – разьбяроў. У сценах бібліятэкі пастаянна дзейнічае *выстава "Разьбяр з Глушыцы"*, на якім змешчаны матэрыялы аб народным майстру Міхасю Валуевічу альбо, як звалі яго ў гэтых мясцінах, дзеду Міхалку. Міхаіл Міхайлавіч Валуевіч доўгі час быў практычна невядомым. Самадзейны майстар, які кожную вольную хвілінку імкнуўся аддаць любімай справе – сталярству, а потым і разьбярству. Адну са сваіх першых прац – амаль у поўны рост скульптуру партызана, якую выразаў з дрэва з партрэта - уласна адвёз у мяшку ў Маладзечанскі (на тыя гады Спондаўшчына адносілася да Маладзечанскай вобласці) краязнаўчы музей. А далей – болей: ад шафаў, калёс і акон, якія даводзілася рабіць пад заказ за грошы, нейк плаўна перайшоў і на рэчы блізкія сэрцу, нават святыя - з-пад рук дзеда Міхалкі выйшаў незвычайнай прыгажосці алтар, з калонамі, са скразной разьбой расліннага арнаменту; скульптура Хрыста з палаючым сэрцам, выкананая ў лепшых народных традыцыях. Прымітыўнымі інструментамі была зроблена дзежка, капітэль,фігурка Маці Божай, часалка для ільну, посуд, "вяроўкі" (так майстар называў вітыя калоны), падстаўкі для слупоў і мн. іншае.





Творы М.Валуевіча дзеляцца на дзве самастойныя групы. Асобную складаюць фігуркі людзей, што характарызавалі майстра свабодай мастацкага вобраза і ўменнем адлюстраваць пачуцці чалавека, яго псіхалогію. Другую - рэчы, якія больш выконвалі практычную ролю, але вылучаліся вонкавым багаццем і складанасцю матываў – збан са здымнай накрыўкай і ўпрыгожаны плоскарэльефнай разьбой, складзенай з трыліснікаў і шасціпялёсткавых кветак, дзежка даўбаная, зробленая с суцэльнага кавалка дрэва, на трох выгнутых ножках, якія надаюць ёй устойлівасць і зграбнасць, калона з капітэлем карынфскага ордэра з тугім сакавітым лісцем аканта, з стромкімі завіткамі.

 

Народны майстар памёр у 1989 годзе. Яшчэ ў 1986 годзе ў Спондаўскай бібліятэцы сабраліся землякі, каб адзначыць 90-годдзе з дня нараджэння майстра. На тым мерапрыемстве актыўны ўдзел прынялі і шаноўныя госці - работнікі цяперашняга Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі ў Гродне, журналісты тэлебачання, даследчыкі творчасці М.М.Валуевіча.



***(Моманты святкавання 90-годдзя М.Валуевіча)***



***(М.Валуевіч за размовай з Н.І.Ляшчонак – навуковым супрацоўнікам Гродзенскага музея гісторыі рэлігіі)***

Быў зняты цудоўны фільм пра народнага разьбяра. М.М.Валуевіч застаўся сімвалам Бацькаўшчыны, якога памятаюць не толькі жыхары Спондаўскага краю. Багаты матэрыял аб ім сабраны і экспануецца ў Спондаўскай бібліятэцы да гэтага часу. Ён запатрабаваны не толькі мясцовымі жыхарамі, але і гасцямі, якіх нямала бывае ў гэтых краях.

У 1987 годзе І.Валуевіч была запрошана Гродзенскім тэлебачаннем на тэлеперадачу “Гараднiца” (рэдактар М.С. Шаўчонак) прысвечаную народным промыслам і майстрам.

І.Ф.Валуевіч сабрала матэрыялы і аб іншых майстрах па дрэву, якіх, магчыма, мясцовае празрыстае паветра, шчодрая зямля і густыя лясы літаральна натхняюць на стварэнне прыгажосці – Яну Буйчыку з Жэлядзей, Кліменцію Лаўрыновічу з Ядабора, Юзафу Пупінскаму з Тэлаяў, Іосіфу Міхновічу са Спондаў, Вікенцію Ягелу, які таксама нарадзіўся ў Глушыцы.

Спонды і сёння славяцца сваімі разьбярамі. Плённа працуе ў гэтых мясцінах Аляксей Казлоўскі, ураджэнец Казахстана. Вось ужо дванаццаць гадоў працуе ён ў лясніцтве і за гэты час стварыў нямала ўласных вырабаў з дрэва – мэблю, узорныя альтанкі,

падсвечнікі, драўляныя лыжкі, велікодныя яйкі – пісанкі. Іаланта Валуевіч сёння збірае звесткі і аб новай маладой плеядзе разьбяроў.

ζζζζ

У верасні 2003 года у Спондаўскім сельскім клубе адбылася вечарына, прысвечаная 120-годдзю з дня нараджэння Янкі Быліны пад назвай “Ёй толькі адной свае песні складаю”.



***(Момант свята: літаратурна-музычную кампазіцыю праводзяць члены клуба “Бацькаўшчына”.Крайняя справа Л.Вітушка, член беларускай грамады Віленшчыны “Сябрына”;Г.Чакур, журналіст газеты “Астравецкая праўда”, член краязнаўчага таварыства “Вільняр”. На заднім плане фотаздымка выстава дзіцячага малюнка, арганізаваная “Астравецкай праўдай”)***

◊◊◊◊

На базе Спондаўскай сельскай бібліятэкі за перыяд з 1981 па 2004 гады праводзіліся раённыя семінары бібліятэчных работнікаў. На высокім ўзроўні

прайшоў краязнаўчы семінар бібліятэчных работнікаў у 2004 годзе. Удзельнікі азнаёміліся з помнікам рэспубліканскага значэння "Камарышкі", батанічным помнікам прыроды "Старажытны дуб", рэспубліканскім ландшафным заказнікам "Сарачанскія азёры"



***(Семінар па краязнаўству бібліятэкараў Астравецкай ЦБС у Спондаўскім сельсавеце. 2004г.)***

Цікава прайшло святкаванне Дня работнікаў лясной гаспадаркі ў 2003 годзе. Ляснічы В.Р.Лукашэвіч коратка пазнаёміў прысутных і калег аб дасягненнях і поспехах лясніцтва, аб планах на будучае, адзначыў лепшых працаўнікоў. Была праведзена экалагічная віктарына-турнір паміж культработнікамі і працаўнікамі лесу. Найбольшую ўвагу ў той дзень адчуваў адзін з лепшых леснікоў не толькі мясцовага лясніцтва, але, бадай, і цэлага Астравецкага раёна – Міхновіч Лёнгін Сідаравіч, які 45 гадоў верай і праўдай служыў свайму зялёнаму сябру. Ён служыць прыкладам для маладых не толькі ў працы, але і ў сямейным жыцці. Не так даўно Л.С.Міхновіч адзначыў

сваё залатое вяселле, з чым яго таксама сардэчна віншавалі калегі.



*(Святкаванне Дня работніка лясной гаспадаркі. 2003г.)*

**Знакамітыя землякі**

Родны мой куточак
Бацькаўшчына міла!
Да цябе так доўга
Сэрцам я спяшыла!
А сёння ў месцы гэтым
На росстані стала –
Цябе, мой куточак
Зусім не пазнала.
Куст бэзу схіліўся
Над камнем палёвым,
А жыў тут калісьці
Станевіч Антоні…
…Сілы не хапае,
Іду, аглянуся.
Бывай, мой куточак-
Можа й шчэ вярнуся!

*Г.Станевіч (прозвішча дзявочае)*

Спондаўшчына слынная знакамітымі людзьмі. Гэта тут нарадзіліся і пражылі свае таленавітыя жыцці на пачатку мінулага стагоддзя беларускі паэт, драматург, каталіцкі святар Янка Быліна, беларускі вучоны, грамадскі дзеяч Адольф Клімовіч. Працаваў ў Клюшчанскім касцёле святаром ураджэнец Астравеччыны Казімір Сваяк.



**Я.Быліна,**



**А. Клімовіч**



**К. Сваяк**

Не меншымі талентамі адораны і сучаснікі-землякі. Многіх з іх раскідаў лёс не толькі ў бліжняе, але і далёкае замежжа. Іаланта Францаўна наладзіла з некаторымі сувязь, запрасіла на Радзіму, арганізавала сустрэчу з людзьмі, хто помніў іх яшчэ малымі дзецьмі. Так, летам адбылася сустрэча з Генуэфай Станевіч (1942г.н.), якая з 18 гадоў жыве ў Літве (Лентварыс), але і па сённяшні дзень не забылася матчыну мову, памятае свой род, кроўную повязь з роднай зямлёй. Гэта яе верш вынесены ў эпіграф раздзела. Вершы яе, магчыма, не зусім адпавядаюць літаратурным патрабаванням, але наколькі блізкія яны простым людзям, яе землякам, колькі ў іх тугі па роднай старонцы, сваё ўласнае, можна сказаць, вясковае асэнсаванне жыцця, ролі чалавека ў Сусвеце.



***Генуэфа Станевіч з Іалантай Валуевіч на парозе яе дома.***

Ідэя завязаць трывалыя кантакты з землякамі, якія жылі далёка па-за межамі Спондаўскай зямлі, з'явілася ў бібліятэкара яшчэ ў далёкім 1982 годзе. Аднаго разу прыводзіла Іаланта Францаўна ў парадак новыя часопісы, гартала "мужчынскі" часопіс "Моделист – конструктор" і на апошняй старонцы зачапілася поглядам за фотаздымак, адзін з некалькіх. На ім малады мужчына настройваў клавішны інструмент. Нешта няўлоўна знаёмае мільганула ў засяроджаным твары гэтага чалавека. Подпіс да здымка расставіў ўсё на свае месцы: "Рижанин Феликс Станевич демонстрирует электромузыкальный синтезатор «Феликс – 201»". Ніякіх сумненняў не заставалася – гэта той 11-гадовы хлапчук з суседняга хутара, які прыбягаў пагуляць да іх. Ён ужо тады быў якісьці сур'ёзны, задумлівы, поўны нейкіх ідэй. Ужо тады адчувалася, што ён даб'ецца пэўных вышынь у жыцці, праславіць сваё імя.

Пазнаёміць Фелікса Станевіча з жыхарамі Спондаў і навакольных вёсак бібліятэкару ўдалося таксама летам мінулага году. Памяталі яго людзі сталага веку, бо выехаў з Глушыцы (хутар каля Спондаў) даўно, яшчэ ў адзінаццацігадовым узросце. Прычынай таму стала цяжкая хвароба Фелікса. Бацькам

прыйшлося памяняць клімат і пераехаць у Латвію, якая стала месцам выздараўлення, юнацтва і станаўлення стала для яго Латвія. Там жа ён паступіў у Рыжскі політэхнічны інстытут, на факультэт радыётэхнікі і сувязі. Шмат гадоў мінула з тых пор, многа рацыяналізатарскіх ідэй прыходзіла ў галаву кемліваму хлопцу.

Сёння Фелікс Станевіч – вядомы рацыяналізатар у вобласці музыкі. Яго сінтэзатар гуку атрымаў залаты медаль на ВДНГ СССР у 1982 годзе, мае вельмі вялікія магчымасці, прыйшоўся да спадобы многім музыкантам. Доўгі час Ф.Станевіч супрацоўнічаў з ансамблем "Орнамент", з якім гастраліраваў па ўсяму свету. Быў узнагароджаны в'етнамскім "Ордэнам дружбы народаў" Праца ў ім дала магчымасць назапасіць багаты вопыт работы з музычнай апаратурай, гукавой тэхнікай, які зямляк выкарыстоўвае і зараз для тэхнічных рашэнняў сваіх канструкцый і канкурыруе нават з замежнымі інжынерамі свайго профілю. Зараз Ф.Станевіч працуе ў Рызе ў філіяле кампаніі Baltic Latvian Universal Electronics (BLUE) галоўным інжынерам. Сама кампанія знаходзіцца ў Лос-Анджэлесе (ЗША) і выпускае студыйныя мікрафоны. Акрамя таго Фелікс супрацоўнічае з фірмай "Audio AF", якая прадае і ўстанаўлівае апаратуру, звязаную з гукам, акустыкай, музыкай.

Ф.Станевіч многае пабачыў, многа дзе пабываў, але сэрцам застаўся верным сваёй радзіме.

- Настальгія па Радзіме ўсе гэтыя гады была велізарная, амаль усе мае сны – пра Глушыцу, нашу рэчку, каймінскія азёры, - гаворыць Фелікс. – Успамінаецца клён, што паіў салодкім сокам увесну – ён як брат, з якім раслі разам і сілкаваліся адным сокам. Я рады магчымасці зноў пабываць на гэтых землях, сустрэць знаёмых людзей.



*Фелікс Станевіч*

Цудоўная цёплая сустрэча адбылася ў Спондаўскай сельскай бібліятэцы з бацькам і сынам Памецькамі. Рычард Сідаравіч Памецька таксама выхадзец з хутара Глушыца, вядомы ў Расіі фізік-ядзершчык, кандыдат тэхнічных навук, які зараз жыве ў Обнінску. Адразу ж пасля заканчэння мясцовай Жукойненскай сярэдняй школы (1960) ён паступіў ў Алуксненскае (Латвія) авіяцыйна-тэхнічнае вучылішча (тады хуткімі тэмпамі развівалася ракетабудаванне). Аднак з-за хваробы ваенная кар'ера не ўдалася. Яшчэ вучачыся ў школе ён захапляўся тэхнікай, у 7-м класе сканструяваў уласнаручна маленькі радыёпрыёмнік, рамантаваў іх усім жадаючым у акрузе.

Фільм "Дзевяць дзён аднаго года" узрушыў Рычарда настолькі, што ён усур'ёз зацікавіўся атамнай энергетыкай. Менавіта гэта стала прычынай яго рашэння паступаць у Маскоўскі інжынерна-тэхнічны інстытут. Трапіў ў новаадкрыты філіял інстытута ў Обніску (зараз дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт атамнай

энергетыкі). Пасля інстытута абараніў кандыдацкую дысертацыю. Далей было насычанае і цікавае жыццё. Праца, звязаная з замежнымі кантактамі і кантрактамі, дазволіла пабываць у Ізраілі, Швецыі, ЗША, Аргенціне, Паўднёвай Карэі. На яго асабістым рахунку – дзесяткі вынаходніцтваў у галіне атамнай энергетыкі, кожная несла ў сабе або эканамічную выгаду, або гарантыю бяспечнай работы той ці іншай установкі, або была навінкай па сваёй сутнасці.

- Ганаруся тым, што нарадзіўся тут, - дзяліўся пры сустрэчы з землякамі асабістым Р.С.Памецька. – Пакуль жыла радня, наведваўся сюды амаль штогод. На запрашэнне Іаланты адгукнуўся адразу – так захацелася з сынам пахадзіць па лесе, парыбачыць, падыхаць родным чыстым паветрам, ягадаў, грыбоў назбіраць. Сяргею (сыну) таксама тутэйшыя мясціны па душы, успамінае іх у Францыі часта.



***Рычард і Сяргей Памецькі з Іаалантай Валуевіч***

Сын, Сяргей Рычардавіч Памецька, таксама чалавек неардынарны. Уплыў бацькі несумненны - з усіх дысцыплін выбар зрабіў на карысць ядзернай

фізікі. Хлопец абраў для сябе вучобу на факультэце "Эксплуатацыя атамных электрастанцый" Обнінскага філіяла Маскоўскага інжынерна-тэхнічнага інстытута, куды паступіў пасля заканчэння школы. З перарывам службы ў войску, дарэчы у Афганістане, адкуль вярнуўся з двума медалямі, вучоба была завершана у Марсельскім універсітэце (туды хлопец папаў у рамках абмену студэнтамі расійскіх і французскіх вышэйшых навучальных устаноў). Французы прапанавалі таленавітаму маладому фізіку тэму для вывучэння ў аспірантуры: "Цяжкія аварыі ядзерных і энергетычных установак і паводзіны расплаўленай актыўнай зоны рэактара". Пасля заканчэння аспірантуры Сяргей абараніў дысертацыю і стаў доктарам філасофіі (па замежнай класіфікацыі такая навуковая ступень прысвойваецца прадстаўнікам усіх прыродазнаўчых навук).

Аднак, не знайшоўшы працы ў Францыі, вярнуўся дамоў. Два гады адпрацаваў у Обнінску, у фірме, якая займалася выпускам трэнажораў для навучання персаналу атамных электрастанцый. У адну з камандзіровак ў Францыю Памецька-малодшы атрымаў там прапанову супрацоўнічаць з фірмай "Корус", што знаходзіцца ў Грэноблі, якая прыступала да ажыццяўлення вялікага праекта "Ewwerest" – па вырабу трэнажораў для савецкіх ядзерных рэактараў В–440. Праект быў паспяхова завершаны. Аднак, са спадам ядзернай энергетыкі, многія перадавыя еўрапейскія краіны пачалі закрываць ядзерныя праграмы і попыт на трэнажоры для АЭС знізіўся. Тым не менш фірма працягвала працу і ў іншым, не менш важным, накірунку – выпуску трэнажораў чыгуначнага транспарту (машыніст лакаматыва ці электрапоезда метро таксама не мае магчымасці навучацца на рабочым месцы. Значыць неабходны такі трэнажор, які поўнасцю адпавядаў бы кабіне лакаматыва і стаяў на сістэме руху, г.зн. ствараецца ўражанне нібы кабіна і

сапраўды рухаецца). Попыт на такія рэчы вялікі, найбольш складаныя заказы паступалі ад ЗША, дзе паязды бываюць звычайна доўгія і цяжкавагавыя. Сяргей зноў акунуўся ў работу, цікавую для сябе і карысную для грамадства. Вось ужо працяглы час ён жыве з сям'ёй паблізу Грэнобля. Глушыца не з'яўляецца радзімай для Сяргея, аднак, пакуль жыла тут бабуля, ён часта бываў у гэтых мясцінах з бацькам. Тым не менш, Сяргей ад усяго сэрца палюбіў Глушыцу, яе прасторныя сенажаці, шчодрыя лясы і асвяжаючую прахалоду азёр. Адсюль і да Беларусі ў цэлым прыемнасць мае. Аднак, вось ужо гадоў дзесяць не было прычыны наведацца на бацькаву малую радзіму. А летась, калі выпала нагода разам з ім па запрашэнню бібліятэкара правесці цэлы водпуск на Спондаўшчыне – ўзрадаваўся.

Сяргей Памецька вельмі цікавы чалавек, любіць спорт – вялікі аматар верхавой язды. Будучы ў Глушыцы, пры любым надвор'і рабіў 40-хвілінныя прабежкі, абліваўся сцюдзёнай калодзежнай вадой, ездзіў конна.



***Сяргей Памецька ў час адпачынку ў Глушыцы***

- Мне вельмі прыемна, што мае землякі і колішнія суседзі, апынуўшыся за тысячы кіламетраў ад радзімы, не забываюць родную Глушыцу, любяць яе

вялікай сыноўняй любоўю, - гаворыць Іаланта Францаўна.

У планах бібліятэкара і надалей шукаць землякоў, весці з імі перапіску, запрашаць на сустрэчы з землякамі, збіраць аб іх матэрыялы.

## “Купалаўскія вакацыі”

Унікальная Спондаўская зямля і сваёй багатай гісторыяй. У свой час гэта быў адзін з асяродкаў беларушчыны. Як згадвалася вышэй, тут нарадзіліся і працавалі такія выбітныя дзеячы нацыянальнага адраджэння пачатку мінулага стагоддзя як Казімір Сваяк, Янка Быліна, Адольф Клімовіч і інш. Ёсць звесткі, што бываў у гэтых мясцінах і славуты пясняр беларускай зямлі Янка Купала. Прынамсі, людзі сталага веку расказваюць, як чулі ад бацькоў пра гістарычны факт – 90 гадоў назад, у бытнасць у Клюшчанах (вельмі прыгожай, самабытнай і багатай гістарычным і культурным мінулым вёсцы) святара Казіміра Сваяка, які быў вядомы сваёй нястомнай працай па адраджэнню ўсяго беларускага, прыязджалі сюды пагасціць Янка Купала і Паўліна Мядзёлка, якой была прысвечана п’еса “Паўлінка”. Тут, у гумне лесніка Хадорскага, мясцовыя артысты з удзелам самой Паўліны Мядзёлкі ажыццявілі адну з першых пастановак легендарнага спектакля. Толькі праз 30 гадоў пазней “Паўлінку” паставілі на сцэне Мінскага гарадскога тэатра і прысвоілі яму імя Янкі Купалы, якое Нацыянальны Акадэмічны тэатр носіць і сёння.

У рамках той знакавай даты артысты купалаўскага тэатра вырашылі вярнуць “Паўлінку” на Астравеччыну і наладзілі ў Спондах у жніўні мінулага году “Купалаўскія вакацыі”. Самы актыўны ўдзел у тым мерапрыемстве прыняла і мясцовы бібліятэкар. Дапамагала ў арганізацыі свята. Яна прадэманстравала прысутным асабліва дарагі для яе фотаздымак Казіміра Сваяка, які яна беражэ як рэліквію і ганарыцца ім, бо

падпісаны яе дзеду Яну Субачу, які з’яўляўся дваюрадным братам Канстанціна і іншых Стаповічаў.Разам з краязнаўцам з суседняга Мядзельскага раёна Іванам Драўніцкім расказалі гасцям шмат займальных гісторый і легенд мясцовасці. Бацька І.Драўніцкага, дарэчы, як расказваў ён сам, тады яшчэ падлетак, таксама прымаў самы непасрэдны ўдзел у той вечарыне і нават умела падыгрываў там на скрыпачцы. Тую скрыпачку 90-гадовай даўніны Іван Драўніцкі таксама прадэманстраваў прысутным, як сведчанне таго, што ўсё было на самой справе. Прыезд двух “вялікіх” людзей у Спондаўскі край у пачатку мінулага стагоддзя не абмяжоўваўся толькі пастаноўкай спектакля ды канцэртам. Гасцінныя гаспадары, як і вадзілася, наладзілі застолле з абедам, чаркай, танцамі і песнямі. Кажуць, што сама Паўліна Мядзёлка па-залiхвацку танчыла польку, спявала прыпеўкі. Такую ж атмасферу пастараліся перадаць і летась на Спондаўшчыне – на беразе возера Каймiна Горная, у маляўнічай мясцовасці, пабудавалі імправізаваную сцэнічную пляцоўку ў выглядзе карабля-парусніка, дзе выступілі не толькі самадзейныя мясцовыя артысты, але і сапраўдныя з Мінску – “купалаўцы”.



Прыемна ўразілі мясцовых жыхароў іх баяніст Леанід Кур’ян, скрыпач Генадзь Вішнякоў і “чалавек-аркестр” Леанід Клунны. Але самым эпагеем свята быў, безумоўна, выхад Паўлінкі, Якіма і пана Быкоўскага,

ролі якіх выконвалі маладыя артысты купалаўскага тэатра Юлія Шпілеўская, Мікалай Прылуцкі і Алег Гарбуз. Хоць гледачам было паказана толькі два ўрыўкі са спектакля (дарэчы і тады, 90 гадоў назад, тут ставіліся, хутчэй усяго таксама толькі некаторыя сцэны), гучныя апладысменты і воклічы “Брава” доўга плылі над люстраной паверхняй возера, падымаліся над густымі шатамі сосен і елак. У той дзень многія астравецкія гледачы (а сабраліся там далёка не толькі спондаўскія жыхары, фэст меў шырокую рэкламу і нават з райцэнтра (больш 50 км) хадзіў асобны маршрут аўтобуса) упершыню пабачылі беларускую дуду і пачулі, як яна гучыць у руках кіраўніка фальк-гурта “Ліцвіны” Уладзіміра Берберава, які выконваў аўтэнтычную народную музыку. Да спадобы прыйшліся і песні, што спяваў пад гітару артыст тэатра і кіно Анатоль Голуб.

На другі дзень, як і 90 гадоў назад, тым жа сродкам руху – на запрэжаных коньмі, засланых мяккім сенам падводах удзельнікі фэсту паехалі ў Барані, наведалі той дом, дзе спыняліся тады шаноўныя госці.



За ўдзел і арганізацыю гэтага свята І.Ф.Валуевіч узнагароджана Ганаровай граматай, а бібліятэка атрымала 5 кніг у дар ад купалаўскага музея.




***Людна было на імправізаванай пляцоўцы на беразе возера Кайміна Горная***

**“Мікратапонімы Спондаўскага краю”**

Асобным радком хацелася б расказаць аб тым, наколькі прыгожыя мясціны – Спондаўскі край. Па-першае, гэта чатырнаццаць сарачанскіх азёр, дванаццаць з якіх злучаны паміж сабой, нібы пацеркі, сярод бязмежнага мора лясоў. Варта толькі раз пабываць у гэтым краі, як назаўсёды трапляеш у палон яго прыгажосці.

З 18 астравецкіх помнікаў прыроды рэспубліканскага значэння два з іх – геалагічны разрэз “Камарышкі” (уключаны ў рэспубліканскую турыстычную сетку) і 500-гадовы старажытны дуб-велікан знаходзяцца на тэрыторыі Спондаўскага сельсавета. Акрамя гэтага, там жа створаны ў 1998 годзе рэспубліканскі ландшафтны заказнік “Сарачанскія азёры” для захавання ўнікальнага прыроднага

комплекса з папуляцыямі рэдкіх і знікаючых відаў раслін і жывёл, занесеных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.

У сувязі з гэтым у раёне створаны праект турыстычнага маршруту “Сарачанскія каралі”: аўтамабільнага, пешаходнага, веласіпеднага і воднага. Маецца на ўвазе, што тут будзе развівацца так папулярны ў апошні час экатурызм.

Не засталася ў баку ад гэтай справы і бібліятэкар Спондаўскай бібліятэкі.У мінулым годзе яна падрыхтавала і пры тэхнічнай дапамозе аддзела маркетынгу Астравецкай ЦБС выпусціла невялікі зборнік “Мікратапонімы Спондаўскага краю”. Мэта гэтага выдання – максімальна сабраць і захаваць для будучых пакаленняў тыя назвы, якімі мясцовыя продкі з пяшчотай называлі кожны куточак роднай зямлі, а таксама тлумачэнні некаторых іх. Тлумачэнні некаторых назваў даюцца са слоў мясцовых старажылаў. Аўтар выдання І.Ф.Валуевіч лічыць, што дадзенае выданне будзе цікавым не толькі гасцям - удзельнікам экатурызму, але і выхадцам Спондаўскіх зямель, яно можа стаць своеасаблівым даведнікам для работнікаў лясніцтва, памежнікаў, паляўнічых. Адам Мальдзіс так выказаўся аб гэтай рабоце: “Кніжка робіць добрае ўражанне. Яна патрэбная”.

§ § § § §

Прыгажосць тутэйшых мясцін натхніла І.Ф.Валуевіч на своеасаблівае хобі – фатаграфаванне. Як вынік гэтаму у 2004 годзе пры бібліятэцы дзейнічала фотавыстава “Мілыя вобразы роднага краю” з раздзеламі “Зара мая, вячэрняя”, “Дзівосы прыроды”, “Постаці”. Адзін з фотаздымкаў апошняга раздзела “У чаканні вясны” быў апублікаваны ў раённай газеце у сакавіку 2005 года. Фотамайстар Алесь Юркойць даў высокую ацэнку гэтаму здымку: “Здымак вельмі балючы і кранаючы. Лічу, што гэта – фотаздымак года”



***(Адна з работ І.Ф.Валуевіч "У чаканні вясны" )***

§§§§

Вялікая работа вялася ў мінулым годзе Іалантай Валуевіч па збору легенд і паданняў. "Чортава балота", "Папова гара", "Воўчы баль" – гэтыя легенды былі апублікаваны летась у мясцовым і рэспубліканскім друку. Краязнаўчыя сцежкі часта сутыкаюць бібліятэкара з цікавымі людзьмі. Так, да прыкладу, многа цікавых паданняў паведала бібліятэкару баба Казя (так завуць у ваколіцах Казіміру Уладзіславаўну Валуевіч). Менавіта яна расказала мясцовую легенду пра гісторыю ўзнікнення вёскі Пілімы, што ў Спондаўскім сельсавеце.

- Калі было адменена прыгоннае права, сабраліся мужчыны пад магутным дубам, што рос тут непадалёк, выпілі квасу на радасцях, павесяліліся, адзначаючы гэту вялікую падзею, і вырашылі заснаваць тут вёску. Назвалі, доўга не думаючы Пілімы, што азначала: пілі мы тут.

Казіміра Уладзіславаўна – жанчына з унікальнай памяццю і дарам расказчыка. Духоўнае багацце яна заўсёды ставіла вышэй матэрыяльнага. І такіх вясковых расказчыкаў у Спондаўскім краі нямала. Для гэтага і прышлося мясцоваму бібліятэкару набыць дыктафон, каб стварыць фонд "вусных мемуараў" – аудыёзапісы ўспамінаў старажылаў.

У 2002 годзе І.Ф.Валуевіч прымала ўдзел у ІІ-х Міжнародных Гашкевічскіх чытаннях з выступленнем на тэму "Народны майстар са Страчы" (аб творчасці Вікенція Францавіча Ягелы). У наступным, 2003 годзе, Іаланта Францаўна выступала з паведамленнем "Клюшчаны і ваколіцы ў пачатку ХХ стагоддзя" на раённых краязнаўчых чытаннях, прысвечаных 120-годдзю Янкі Быліны, што праходзілі на яго радзіме, у вёсцы Лакцяны.

Іаланта Францаўна сваёй працай выдатна паказвае, што духоўныя і агульначалавечыя каштоўнасці, экалагічную адукацыю, фарміраванне патрыятычных пачуццяў, арганізацыю вольнага часу насельніцтва можна арганізаваць у бібліятэках пры любых умовах. Пераход да рынкавай эканомікі ў любых краінах свету балюча ўдарыў па такіх сацыяльных установах, як адукацыйныя і культурныя. І ўсё тое напрацаванае, што маецца сёння ў нашых бібліятэках, можна развіваць і якасна выкарыстоўваць у абслугоўванні насельніцтва. Некаторыя матэрыялы І.Ф.Валуевіч уключаны ў раённую кнігу "Памяць".
Узнагароджана 13 граматамі. Па выніках работы 2003 года занесена на раённую Дошку гонару бібліятэчных работнікаў. У 2004 годзе – на Дошку гонару Спондаўскага сельскага Савета, дэпутатам якога з'яўляецца зараз.

Краязнаўчая дзейнасць Іаланты не засталася незаўважанай і чытачамі. Аб гэтым сведчыць і верш землячкі Генуэфы Станевіч, які так і называецца:

## “Іаланце Валуевіч з удзячнасцю”

Ад Іаланты Валуевіч менавіта
Карэспандэнткі шмат таленавітай
Часопіс «Барвы» сёння атрымала!
Да поўначы ўсё да кропкі прачытала.
Крыху паплакала ад радасці, пазайздравала
Сваёй радзіме, свайму краю,
Так многа талентаў ён мае.
Якая проза, вершы і легенды
І сіла слова светлага імгненне!
Сяло ці вёска ў родным краю
Гісторыю сваю або легенду мае.
Хвала таму, хто гэты скарб збірае
Хто сэрцам любіць і нашчадкам захавае.
Каб кожны талент кветкаю назваць,
І кветкі гэтыя усе ў адно сабраць,
Вянок з іх атрымаўся б, мусіць,
Найпрыгажэйшы у Беларусі.
У тым суквецці міліёне
Была б я рада быць былінкаю зялёнай

## Заахвочванні і ўзнагароджанні І.Ф.Валуевіч

1. **1977. 02.15**. Узнагароджана.
2. **1985.01.23**. Присвоено звание "Ударник коммунистического труда".
   Заняла 1-ое место в соцсоревновании по итогам работы 1984 года. Награждена ценным подарком.
3. **1987.01**. Заняла 1-ое место в областном смотре – конкурсе на лучшую постановку работы по культурному обслуживанию населённых пунктов, не имеющих стационарных учреждений культуры.
   Награждена Почётной грамотой и денежной премией.
4. Благодарность:
   Принимала участие в проведении Всесоюзной переписи 1989 года в качестве инструктора-кантролёра.
5. По итогам работы за 1989 год и в соцсоревновании между библиотеками ЦБС заняла первое место, награждена ценным подарком.
6. **2001.10.12.** Узнагароджана Ганаровай граматай Астравецкага раённага выканаўчага камітэта і Прэзідыума раённага Савета дэпутатаў за шматгадовую, плённую працу па арганізацыі бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва і ў сувязі з прафесіянальным святам – Днём работнікаў культуры.
7. **2004.01.30.** Узнагароджана Ганаровай граматай ўпраўлення культуры аблвыканкама за ўклад у адраджэнне і зберажэнне гісторыка-культурнай спадчыны і ў сувязі з юбілеем з дня нараджэння.
8. Прызнана пераможцай у раённым конкурсе "Культработнік года" ў намінацыі "Бібліятэкар 2003 года". Узнагароджана грашовай прэміяй.
9. **2004.02.05**.Занесена на раённую Дошку гонару работнікаў ЦБС.


ГРАМАТА


ПОЧЕТНАЯ
ГРАМОТА


Грамота


ПОЧЕТНАЯ
ГРАМОТА


ГРАМОТА




ДИПЛОМ


ПОЧЕТНАЯ
ГРАМОТА


ГРАМОТА




ГРАМОТА


ГРАМОТА



## Урыўкі з матэрыялаў

**Л.Місуна. Не ўяўляю сябе на іншым месцы…//Астравецкая праўда. – 1979.**

“Слава аб добрых справах чалавека распаўсюджваецца хутка. Настойлівасць у працы, адданасць абранай справе, любоў да яе заўсёды заслугоўвалі павагу, знаходзілі водгук у чалавечых сэрцах.

Часта даводзілася чуць аб добрай рабоце бібліятэкара Спондаўскай сельскай бібліятэкі Іаланты Валуевіч, аб ініцыятыўнасці і руплівасці дзяўчыны, імкненні як мага лепш накіраваць работу бібліятэкі.

Вырашыла сустрэцца з Іалантай бліжэй, пазнаёміцца з яе работай. І вось бібліятэка. Адразу, з першага погляду, можна вызначыць, што чалавек, які тут працуе, як кажуць, працуе з душой. Гэта адчуваецца ва ўсім: і ва ўмела, з густам афармленых кніжных палічках, і ў цікавых падборках тэматычнай літаратуры…

…Вось што расказвае аб сабе Іаланта: “Кнігі былі маімі пастаяннымі сябрамі яшчэ з дзяцінства. І пасля сканчэння дзесяцігодкі я пайшла працаваць у бібліятэку. Для таго, каб набыць патрэбныя веды ў цікавячай мяне спецыяльнасці, паступіла на завочнае аддзяленне інстытута культуры. Да сваёй справы прырасла душой і не ўяўляю сябе на іншым месцы”.

Нямала клопатаў у бібліятэкара. Спондаўская бібліятэка абслугоўвае два калгасы: “50-год ВЛКСМ” і “Савецкая Беларусь”, усяго 15 населеных пунктаў. У асобных вёсках працуюць чатыры бібліятэкі-перасоўкі. Зараз налічваецца 700 пастаянных чытачоў і з году ў год іх лік расце. Кожнаму трэба ўдзяліць увагу, правільна зразумець яго попыт. Аднак Іаланце ўдалося ўстанавіць цесны кантакт з чытачамі. Гэтаму дапамагаюць тэматычныя вечары, чытальніцкія канферэнцыі, вусныя часопісы, гутаркі, бібліяграфічныя агляды…

…Пастаянную сувязь падтрымлівае бібліятэка і са школай. Юныя чытачы аказваюць дапамогу ў правядзенні розных мерапрыемстваў, дапамагаюць у распаўсюджванні літаратуры.

А наперадзе яшчэ мноства задум, мноства пытанняў, якія патрабуюць вырашэння. Так, напрыклад, бібліятэцы

вельмі патрэбна чытальная зала, каб была магчымасць моладзі, якая пастаянна збіраецца ў бібліятэцы пасля працоўнага дня пагартаць часопісы, паглядзець тэлевізар, паслухаць музычныя запісы. Дарэчы, у сельскай бібліятэцы створана нядрэнная фанатэка, у якой налічваецца звыш 100 дакументальных запісаў народнай і сучаснай музыкі.

Паляпшаць арганізацыю абслугоўвання чытачоў, узмацняць выхаваўчую работу ў вёсцы – вось пытанні, якія пастаянна хвалююць бібліятэкара, ад вырашэння якіх залежыць поспех яе працы.

**З.Волгина, С.Михальчик, сотрудники Гродненской областной библиотеки им. Карского. Сельский библиотекарь // Гродненская правда. – 1984**

Труженики колхоза “Советская Белоруссия” Островецкого района хорошо знают И.Ф.Волуевич, которая более десяти лет заведует сельской библиотекой в Спондах. Вся её работа связана с делами хлеборобов, воспитанием молодёжи. Книголюбы знают её как неутомимого пропагандиста лучших произведений русской советской и зарубежной литературы.

Иоланта Францевна хорошо укомплектовала фонд библиотеки, где собрано более 14 тысяч книг. Есть здесь что выбрать полеводу, животноводу, механизатору, поэтому библиотеку охотно посещают около 700 жителей Спондов и ближних деревень. А ветаранам войны и труда 14 книгонош-общественниц доставляют литературу домой...

...Подготовка к 40-летию Великой Победы советского народа в Великой Отечественной войне открывает новые возможности для патриотического воспитания молодёжи. Тематические вечера “Обелиски мужества”, “Этих дней не смолкнет слава”, “Разве можно забыть!” были посвящены нашим знатным землякам. Большую помощь библиотекарю оказывает бывший партизан, создатель местного музея боевой славы И.Н.Мартынов. Он – постоянный участник бесед среди молодёжи о героическом прошлом и настоящем нашего народа. В числе активистов библиотеки Е.Валуевич, К.Заянчковская, А.Горбаль, В.Шурацкий и др.

**З.Волгина, Е.Ушева. Жить достойно:Методические рекомендации по организации работы по нравственному воспитанию молодёжи на примере Спондовской сельской библиотеки. – Гродно. – 1984.**

В центре деревни Спонды Островецкого района под высокими тополями заметно выделяется здание, в котором находится сельская библиотека. И это не просто внешняя примета уважения к дому, где живут книги. В Спондах справедливо считают, что дороги к урожаю лежат через библиотеку, ставшую здесь и школой передового опыта, и центром общения односельчан.

У современного сельского библиотекаря немало забот. И все они причастны к хлеборобским делам, воспитанию молодёжи. Труженники колхоза "Советская Белоруссия" хорошо знают И.Ф. Волуевич, которая более десяти лет заведует библиотекой.

Профессия библиотекаря предъявляет к человеку важнейшее требование: всё, чему учишь других, должно быть в тебе самом.Все знания, полученные в Минском университете культуры во многом помогают И.Ф.Волуевич копить в себе духовный запас и делиться ими с читателями.

Более трёх лет библиотекой проводится систематическая работа по созданию нравственного авторитета книги среди читателей. Здесь объединили свои усилия совместно с библиоткой сельский Дом культуры, средняя школа, правление колхоза "Советская Белоруссия"

А началось всё с того, что на одном из районных семинаров в Островце шёл разговор о пропаганде литературы среди читателей по вопросам нравственного воспитания. После семинара И.Ф.Волуевич сделала критический анализ своей работы и пришла к убеждению, что пропаганду литературы по этой теме ведёт ещё неуверенно, немасштабно. Поэтому Иоланта Францевна с помощью рекомендательных библиографических пособий "Нравственное воспитание учащихся", "Воспитание молодёжи на великих примерах жизни и деятельности В.И.Ленина", "Твой нравственный идеал", "Любителям книги" и др. установила, в какой степени фонд обеспечен научно-популярной, справочной и художественной литературой с учётом того, что основной контингент

читателей библиотеки имеет среднее или незаконченное среднее образование. Более внимательное знакомство с содержанием произведений позволило ей шире и последовательнее расрыть на выставках и тематических полках фонд общественно-политической литературы, книги по литературоведению и искусству. И с учётом индивидуальных особенностей рекомендовать их читателям, используя девиз “Умей познать красоту”, дорожи ею, береги её”

Для учащихся и учителей средней школы была проведена читательская конференция “Книга в духовной жизни человека”, затем организована “Неделя книги” во время весенних каникул...

Важным средством идеологического воздействия на молодёжь, живущую в сельской местности, является кино. Библиотекарь активно участвует в составлении кинорепертуаров. Она понимает, что сельская библиотека, сельский клуб и киноустановка призваны заниматься одним общим делом – воспитанием человека. Вот почему здесь совместно проводились обсуждения таких фильмов, как “И это всё о нём”, “Доживём до понедельника”

Одна из центральных тем в работе библиотеки – приобщение юношества к сознательной деятельности, воспитание трудом: литературный вечер “Мы в этот мир явились с добротой”, вечера вопросов и ответов по профессиональной ориентации, тематические вечера: “Мы все в ответе”, “Село – твой дом, и ты его хозяин” и другие мероприятия помогают формировать любовь к родной земле, добросовестное отношение к труду.

Кропотливая индивидуальная работа с читателями на абонементе, интересные массоввые мероприятия, проводимые при помощи актива читателей дают свои результаты. По сравнению с 1978г. книговыдача общественно-политической и художественной литературы выросла почти в два раза и составляет 75% от общей книговыдачи. Каждым читателем библиотеки прочитывается свыше 20 книг в год (по республике 18,9), посещаемость составляет 8 раз. Но главная заслуга в том, что возросла активность молодых читателей, усилилось влияние библиотекаря на них. “Нас вы учили понимать чувство

долга, ответственности, любви к своей Родине. Спасибо!” – сказал на одном из диспутов Володя Шурацкий. И это откровение – лучшее подтверждение того, что интересная и творческая работа по воспитанию высоких нравственных качеств приносит свои плоды. А это очень важно: ведь библиотека, как идеологическое учреждение, призвана раскрывать подлинный гуманизм нашей коллективистской морали, вести неотступный бой против эгоизма.

Формы и методы работы Спондовской сельской билиотеки по нравственному воспитанию молодёжи рекомендуем внедрить в практику работы библиотек области.

**Валуевіч І. Ведаць і шанаваць // Астравецкая праўда. – 1993.**

***Аднойчы я злавіла сябе на думцы, што за гады працы ў Спондаўскай бібліятэцы, а іх ужо прайшло нямала, толькі зараз зразумела, наколькі люблю сваю работу.***

***Мне заўсёды хацелася больш даведацца пра мясціны, у якіх жыву, глыбей пранікнуць у іх гісторыю, сабраць паболей звестак пра знакамітых і малавядомых, але таленавітых, адметных людзей, якія складаюць славу, гонар Астравеччыны.***

***Думаю многіх маіх калег і не толькі засмучае, што мы мала ведаем беларускіх мастакоў, скульптараў, архітэктараў, незнаёмы з іх творамі. Між тым, гэта вялікі пласт, надзвычай важная састаўная частка нацыянальнай культуры, да якой грэх не далучыцца. Мажліва, трэба адшукаць магчымасць і патроху вывучаць творчасць выдатных беларускіх дзеячаў мастацтва, завязваць з гэтымі людзьмі знаёмства і запрашаць да сябе ў клубу, бібліятэкі.***

***Напэўна, ўсе мы адчулі, наколькі вялікі інтарэс прабуджаецца ў людзей да народнай культуры, нацыянальнай духоўнай спадчыны, да ўсяго таго, чаму раней знарок не надавалася значэння. Ідзе працэс адраджэння нацыянальнай памяці і задача культработнікаў гэтаму ўсяляк садзейнічаць.***

**Валуевіч І. Захавальніца мясцовых легенд: жывая гісторыя// Астравецкая праўда. – 2003.**

***За гарамі, за лясамі заблудзілася вёсачка Пілімы, што ў Спондаўскім сельсавеце. Калі звярнуць на дарогу, якая вядзе ў Пілімы з боку Масцян, то непадалёк ад галоўнай дарогі можна ўбачыць знакаміты "Чортаў камень", які, кажуць, у далёкім мінулым служыў арыенцірам для войск Напалеона. А ў самым пачатку вёскі трапляеш у прыгожую алею, якая зімой уяўляе сабой нейкае казачнае царства, урачыста-святочная яна ўвосень і вясной, а летам сустракае спадарожніка такім спакоем і прахалодай, што міжволі хочацца прыпыніцца, адпачыць у цяні, задумацца аб хуткацечнасці часу, аб нечым вечным…***

***Краязнаўчыя сцежкі прывялі мяне да бабы Казі, Казіміры Уладзіславаўны Валуевіч. Яна і расказала, што гэту алею пасадзіў ў пачатку мінулага стагоддзя Алёша Кісель.***

***Раней Пілімы славіліся сваімі майстрамі – мужчыны рабілі арфы, малатарні, труны, куфры, рамкі для абразоў, палічкі для ручнікоў, выраблялі скуры і шылі кажухі і армякі. А яшчэ Пілімы славіліся мнагадзетнымі сем'ямі – па 12, 13, 10, 8 дзяцей.***

***Казіміра Уладзіславаўна ведае гісторыю сваёй мясцовасці амаль дасканала і ахвотна дзеліцца сваімі ўспамінамі. Валодае прыгожым голасам, ведае вялікае мноства розных песень: польскіх і беларускіх, самотных і вясёлых, вясельных і радзінных, жніўных і інш.***

## Бібліяграфія

Валуевіч І. Ведаць і шанаваць // Астравецкая праўда. – 1993. – 10 сакавіка.

Валуевіч І. Воўчы баль // Астравецкая праўда. -2004. -18 верасня

Валуевіч І. Дзед Мароз гуляў па Спондах // Астравецкая праўда. – 2003. – 4 студзеня. –с. 1.

Валуевіч І.Дапіўся: Смешнае здароўе // Астравецкая праўда. –1994.- 15 марта.

Валуевіч І. Дзед Мароз гуляў па Спондах //Астравецкая праўда. -2003. - 4 студзеня

Валуевіч І. Дзякуем за падарункі: [Аб спонсарах Спондаўскай бібліятэкі] // Астравецкая праўда. – 2003. -20 снежня. –с.1.

Валуевіч І. Захавальніца мясцовых легенд // Астравецкая праўда. – 2003. – 17 мая. – с. 3

Валуевіч І. Марскі афіцэр з Трашчан //Астравецкая праўда. – 2005 26 лютага

Валуевіч І. Мікратапонімы Спондаўскага краю: [Артыкул бібліятэкара Спондаўскай сельскай бібліятэкі] // Астравецкая праўда. – 2004. – 15 мая

Валуевіч І. Народны ўмелец са Страчы: [Пра разьбяра В.Ф.Ягелу (1898 – 1976)] // Астравецкая праўда. – 2002. – 20 лістапада. – с. 3

Валуевіч І. Народны ўмелец са Страчы: [Пра разьбяра В.Ф.Ягелу (1898 – 1976)] / І.Валуевіч // Беларусь-Японія: Матэрыялы Другіх міжнародных чытанняў, прысвечаных памяці Іосіфа Гашкевіча, Мінск-Астравец, 9-10 кастрычніка 2002г.. –Мн.:"Беларускі кнігазбор",2003. -400с.:іл. – с.337.

Валуевіч І.Ф.Не ачарсцвелі душы. // Астравецкая праўда.- 2004. – 11 снежня. – с. 1 [ Падзяка спонсарам Спондаўскай бібліятэкі].

Валуевіч І. Новыя клопаты Рыгора Доўгага // Беларуская лясная газета. - 2003. – 16 студзеня.

Валуевіч І. Ноч перад Ражаством // Астравецкая праўда. - 2002. -31 снежня.

Валуевіч І. Паварожым..? // Астравецкая праўда.- 1995. – 23 снежня.

Валуевіч І. "Палаючае сэрца" майстра // Астравецкая праўда. -2003. -19 красавіка

Валуевіч І. Патэлефанавала сяброўка. -2004. – 25 верасня
Валуевіч І. Пашанцавала // Родная прырода. – 2003. - №2. – с. 4. [Бываліца].
Валуевіч Іаланта. Пра зямлячку Станевіч Генуэфу. /І.Валуевіч/ // Краязнаўчая газета. – 2004. - №48. с. 5.
Валуевіч Іаланата. Прадаўжальнік разьбярскіх традыцый. /І.Валуевіч/ //Астравецкая праўда. – 2005. -15 студзеня. –с. 4. [ Пра разьбяра па дрэву Аляксея Казлоўскага].
Валуевіч Іяланта Прыцягненне малой Радзімы. Сын: [Артыкул бібліятэкара Спондаўскай бібліятэкі аб земляку Сяргею Памецька] // Астравецкая праўда. – 2004. -13 лістапада. – с. 5
Валуевіч І. Слёзы святой Дзевы //Астравецкая праўда. -2004. – 24 снежня
Валуевіч І. Тайны Глухога возера // Савецкая Беларусія. – 2003. жнівень.
Валуевіч І.  Таленавітыя леснікі // Астравецкая праўда. -2002. -11 снежня
Валуевіч І. Таямніцы Глухога возера // Роднае слова. – 2004. - №6. –с. 4-5.
Валуевіч І. Таямніцы Глухога возера //Беларуская лясная газета. – 2004. – 14 кастрычніка
Валуевіч І. Успомніць слаўныя падзеі // Астравецкая праўда. – 1980. – 8 верасня.
Валуевіч І. Цікавалі адзін аднога // Беларуская лясная газета. -2003. – 27 сакавіка
Валуевіч І. Чортава балота. Папова гара // Астравецкая праўда. -2004. – 21 жніўня.
Валуевіч І. Шматгранны талент // Астравецкая праўда. – 2004. – 28 жніўня
Валуевіч І. Шматгранны талент // Барвы. -2004. №2.
Валуевіч І. Як звалі нашых бабуль і дзядуль // Астравецкая праўда. – 2004. -14 лютага. –с. 6.
Валуевіч І. Якім я помню гэты край // Барвы. -2004. №2.
Волгіна З., Міхальчык С. Сельский библиотекарь// Гродзенская праўда. – 1984. – 14 снежня.
Волгина З.Ш., Ушева Е.А. Жить достойно: Методические рекомендации по организации работы по нравственному воспитанию молодёжи. [Организация работы Спондовской

сельской библиотеки Островецкого района по нравственному воспитанию молодёжи].
Гудас А. “Беларусь ідзе гарой...” [Вечар, прысвечаны К.Сваяку ў Спондаўскай бібліятэцы]. // Астравецкая праўда. 1990. – 24 лютага. Мурылёва Л. Бібліятэкар // Астравецкая праўда. – 1990. – 17 сакавіка.
Замара І.Чароўная Іяланта // Астравецкая праўда.- 1993 -22 снежня. – с.3 [Інтэрв’ю з бібліятэкарам Спондаўскай бібліятэкі І.Валуевіч].
Караткевіч А. Прэса Спондаўскага маштабу// Раніца. – 2003. - 3 мая
Місуна Л. Камсамольская іскрынка. – 1978 // Астравецкая праўда. – 24 чэрвеня.
Місуна Л. Не ўяўляю сябе на іншым месцы // Астравецкая праўда. – 1979. – 28 ліпеня.
Місуна Л. Працуе выстаўка //Астравецкая праўда. – 1983. – 25 кастрычніка.
Равойць І. “Палаючае сэрца” майстра: Нарыс. // Настаўніцкая газета.- 2005. – 25 студзеня - с. 4. [Аб М.Валуевічу].
Ромаш.Р.Землякі ёй удзячны. /Р.Ромаш/ //Астравецкая праўда. – 2005. – 22 студзеня. – с. 2. [Пра бібліятэкара Спондаўскай бібліятэкі ].
Рыбік Н. Камсамол – не проста ўзрост // Астравецкая праўда. – 2003. – 29 кастрычніка

# Дадатак




**Першыя культработнікі Спондаўшчыны (Злева: Шура Мурашка, загадчыца Спондаўскага клуба; справа – Буйніцкі К.В. – бібліятэкар)**



***Такой Іаланта Францаўна Валуевіч прыйшла на працу Каля акна бібліятэкі (1972 год)***

І.Ф.Валуевіч у 2004 годзе



Такі турыстычны маршрут распрацаваны мясцовымі школьнікамі ў Спондаўскім краі





**1953г. Самадзейныя артысты пасля першай пастаноўкі п'есы Я.Купалы "Паўлінка" ў в. Жукойні-Жалядскія. Музыкант – К.В.Буйніцкі.**



**Адна з першых бібліятэкараў в.Спонды С.М.Налівайка ля веснічак тагачаснай бібліятэкі.**



**Тлумачэнне дыяграмы са ст.6 “Рух фонду Спондаўскай бібліятэкі з 1972-2004гг.”**

## Спондаўскія мясціны



Чортаў мост



Трысцяніцы